МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

# ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІЗАЦЫІ Ў 1920-ЫЯ ГГ.

*Праграма факультатыўных заняткаў для вучняў 10 класа агульнаадукацыйных устаноў*

Мінск 2008

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

У змесце факультатыўных заняткаў “Палітыка беларусізацыі ў 1920-ыя гг.” адлюстраваны працэс распрацоўкі палітыкі беларусізацыі, раскрываюцца яе сутнасць і прызначэнне, яе разуменне ў 1920-я гг., асаблівасці і этапы яе ажыццяўлення, яе тэндэнцыі і супярэчнасці.

Палітыка беларусізацыі ў 1920-ыя гг. была часткай палітыкі нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на савецкай аснове. Дзяржаўная падтрымка культуры, адукацыі, навукі прынесла вынік.

Актуальнасць вывучэння пытанняў нацыянальна-культурнай палітыкі ў 1920-ыя гг. звязана з фарміраваннем у вучняў дэтальнага ўяўлення аб найбольш важных падзеях з гісторыі Беларусі для выхавання ў іх пачуцця патрыятызму, нацыянальнай і грамадзянскай свядомасці.

**Мэта факультатыўных заняткаў** – пашырыць і паглыбіць веды вучняў па праблеме сутнасці і развіцця палітыкі беларусізацыі ў 1920-ыя гг.

**Задачамі факультатыўных заняткаў** з’яўляюцца:

1) на падставе гістарыяграфічных і дакументальных матэрыялаў раскрыць вытокі, прычыны, мэты і сутнасць беларускай нацыянальна-культурнай палітыкі ў 1920-я гг., яе вынікі і здабыткі;

2) садзейнічаць развіццю пазнавальнай цікавасці вучняў да праблем гісторыі Беларусі;

3) развіваць уменне вучняў уступаць у палеміку і адстойваць свае погляды;

4) фарміраваць уменні і навыкі вучняў, патрэбныя для самастойнага даследавання праблем гісторыі;

5) спрыяць выхаванню ў вучняў пачуцця патрыятызму, нацыянальнай і грамадзянскай свядомасці.

Рэалізацыі задач факультатыўных заняткаў будзе спрыяць выкарыстанне актыўных формаў і метадаў навучання. У першую чаргу, рэкамендуецца правядзенне ўрокаў-практыкумаў, семінараў, на якіх вучні будуць працаваць з рознымі гістарычнымі крыніцамі інфармацыі: дакументамі, навуковай, навукова-папулярнай, энцыклапедычнай літаратурай; на аснове раней атрыманых ведаў і ўменняў самастойна рашаць пазнавальныя задачы і праблемныя заданні, прадстаўляць вынікі індывідуальнай і калектыўнай пазнавальнай дзейнасці. Мэтазгодна стымуляванне індывідуальнай самастойнай працы вучняў.

Праграма факультатыўных заняткаў разлічана на 17 гадзін. Пры планаванні вучэбнага працэсу настаўнік мае права самастойна вызначаць колькасць гадзін на вывучэнне той ці іншай тэмы з улікам пазнавальных магчымасцей і інтарэсаў вучняў.

# ЗМЕСТ

**Уводзіны.** Шырокае і вузкае разуменне паняцця “беларусізацыя”. Сутнасць палітыкі беларусізацыі. Этапы правядзення палітыкі беларусізацыі ў 1920-ыя гг. Крыніцы па вывучэнні праблем ажыццяўлення беларускай нацыянальна-культурнай палітыкі ў 1920-ыя гг.

**Раздзел 1. Ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі.**

**Вытокі беларусізацыі.** Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у пачатку XX ст. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці. Беларусізацыя – частка нацыянальнай палітыкі. Ініцыятары і аўтары палітыкі беларусізацыі (А. Чарвякоў, З. Жылуновіч, У. Ігнатоўскі, А. Бурбіс, А. Баліцкі).

**Пачатак афіцыйнага курса на ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі.** Вызначэнне шляхоў і метадаў ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі ў дакументах КП(б)Б. Даклад А. Чарвякова “Нацыянальныя моманты ў дзяржаўным і партыйным будаўніцтве” на VII з’ездзе КП(б)Б (сакавік 1923 г.). Пастанова 2-й сесіі ЦВК БССР “Аб практычных мерапрыемствах па правядзенню нацыянальнай палітыкі” (15 ліпеня 1924 г.): курс на правядзенне беларусізацыі як дзяржаўнай палітыкі.

**Шляхі, формы і метады ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі.** Асаблівасці нацыянальнага складу насельніцтва. Спецыфіка моўнай сітуацыі. Пашырэнне сферы функцыянавання беларускай мовы. Праца культурна-асветніцкіх устаноў па павышэнню нацыянальнай свядомасці беларускага насельніцтва. Карэнізацыя і яе сутнасць. Друк на нацыянальных мовах. Адметнасці нацыянальна-культурнай палітыкі ва ўсходніх беларускіх губернях.

**Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі.** Мэта канферэнцыі. Геаграфія дэлегатаў канферэнцыі. Міжнароднае гучанне канферэнцыі. Даклад С. Некрашэвіча “Сучасны стан беларускай мовы”. Знаёмства з набыткамі слоўнікавай камісіі Інстытута беларускай культуры. Значэнне канферэнцыі.

**Праблемы на шляху правядзення палітыкі беларусізацыі.** Супрацьдзеянне правядзенню палітыкі беларусізацыі з боку чыноўнікаў, русіфікаваных выкладчыкаў і настаўнікаў. Непрыняцце беларускай мовы і культуры групай партыйных і дзяржаўных дзеячаў. Адносіны насельніцтва да палітыкі беларусізацыі. Тэндэнцыя да антыбеларусізацыі.

**Вынікі першага этапу правядзення палітыкі беларусізацыі (1924-1927 гг.).** Прыняцце і пачатак актыўнага правядзення ў жыццё партыйных і дзяржаўных рашэнняў. Агітацыйна-арганізацыйная работа па ажыццяўленню палітыкі беларусізацыі. Вынікі першага года ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі ў БССР (паводле рэзалюцыі пленума ЦК КП(б)Б “Аб нацыянальнай палітыцы” (13 кастрычніка 1925 г.)). Пашырэнне выкарыстання роднай мовы. Палітыка беларусізацыі ў раёнах Сібіры і Далёкага Усходу. Задачы на другі этап ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі.

**Згортванне палітыкі беларусізацыі.** Стан беларусізацыі ў канцы 1920-х гг. Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б "Аб ходзе работы па беларусізацыі дзяржаўных, прафесіянальных, гаспадарчых і кааператыўных устаноў БССР" (25 верасня 1928 г.). Вывучэнне практыкі правядзення нацыянальнай палітыкі ў БССР Нацкамісіяй пры ЦВК БССР. Прычыны згортвання палітыкі беларусізацыі ў канцы 1920 – пачатку 1930-х гг.

**Раздзел 2. Развіццё нацыянальнай культуры ў 1920-ыя гг.**

**Адукацыя.** Ліквідацыя непісьменнасці і малапісьменнасці. Стварэнне сістэмы народнай адукацыі. Рэарганізацыя школ. Падручнікі. Падрыхтоўка настаўніцкіх кадраў. Сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Вышэйшыя навучальныя ўстановы.

**Нараджэнне і станаўленне беларускай савецкай навукі.** У. Ігнатоўскі – ініцыятар стварэння Навукова-тэрміналагічнай камісіі пры Наркамаце асветы. Інстытут беларускай культуры. Беларуская акадэмія навук. Беларускі дзяржаўны музей як навукова-даследчая ўстанова. Навукова-даследчыя інстытуты.

**Развіццё краязнаўства.** Краязнаўчыя арганізацыі і гурткі. Цэнтральнае бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры. І Усебеларуская краязнаўчая канферэнцыя (лістапад 1924 г.). І Усебеларускі краязнаўчы з'езд (люты 1926 г.). Краязнаўчыя выданні.

**Развіццё літаратуры.** Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай літаратуры ў 1920-ыя гг. Літаратурныя аб'яднанні: "Маладняк" (Міхась Чарот, Кузьма Чорны, Уладзімір Дубоўка, Паўлюк Трус), "Узвышша" (Кузьма Чорны, Уладзімір Дубоўка, Змітрок Бядуля, Тодар Кляшторны), "Полымя" (Міхась Чарот, Якуб Колас, Янка Купала), БелАПП (Змітрок Бядуля, Тодар Кляшторны, Кузьма Чорны).

**Тэатральнае жыццё.** Беларуская драматычная студыя ў Маскве. Беларускі дзяржаўны тэатр (Ф. Ждановіч, Е. Міровіч, Л. Літвінаў). Другі Беларускі дзяржаўны тэатр (П. Малчанаў, С. Станюта, А. Ільінскі). Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай драматургіі. Цэнзура ў тэатральным мастацтве.

**Выяўленчае мастацтва і скульптура.** Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускага выяўленчага мастацтва. Міхал Станюта. Міхаіл Філіповіч. Янкель Кругер. Уладзімір Кудрэвіч. Экспедыцыя па вывучэнні беларускай народнай творчасці. Станаўленне беларускай скульптуры. Станковы партрэт (Аляксандр Грубэ, Абрам Бразер).

**Перыядычны друк і выдавецкая справа.** Газеты ("Звязда", "Беларуская вёска", "Савецкая Беларусь", "Чырвоная змена", "Рабочий"). Часопісы ("Вольны сцяг", "Полымя", "Маладняк", "Узвышша"). Выдавецтвы (Дзяржаўнае выдавецтва БССР, кааператыўна-выдавецкае таварыства "Адраджэнне", выдавецтва "Савецкая Беларусь", Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, газетна-часопісныя выдавецтвы).

**Кіно.** Станаўленне беларускага кіно. Кінастудыя "Савецкая Беларусь". Ю. Тарыч ("Лясная быль", "Да заўтра"). У. Гардзін ("Кастусь Каліноўскі").

**Абагульняючы занятак.** Вопыт і праблемы ў працэсе ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі ў 1920-ыя гг. Вынікі і ўрокі ажыццяўлення беларускай нацыянальна-культурнай палітыкі ў 1920-ыя гг.

# ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ

У выніку вывучэння факультатыўных заняткаў вучні:

атрымліваюць уяўленні аб сутнасці, шляхах, формах і метадах ажыццяўлення палітыкі беларусізацыі ў 1920-ыя гг.; адносінах насельніцтва да палітыкі беларусізацыі; дасягненнях, праблемах у працэсе ажыццяўлення беларускай нацыянальна-культурнай палітыкі; здабытках культурнага будаўніцтва ў 1920-ыя гг.; выніках і ўроках ажыццяўлення беларускай нацыянальна-культурнай палітыкі ў 1920-ыя гг.;

удасканальваюць уменні працаваць з гістарычнымі дакументамі, навукова-папулярнай і даведачнай літаратурай, перыядычнымі выданнямі, гістарычнымі картамі, аналізаваць і параўноўваць інфармацыю розных крыніц; весці пошук гістарычнай літаратуры ў каталогах (у тым ліку электронным); даваць характарыстыку гістарычных падзей, аргументаваць свае адносіны да іх; аналізаваць, абагульняць і ацэньваць гістарычныя факты, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі паміж імі; рыхтаваць паведамленне (даклад, рэферат), выступаць з ім, разгортваць дыскусію.

# ЛІТАРАТУРА

## Асноўная літаратура


1. Беларусізацыя: 1920-я гады: Дакументы і матэрыялы / Пад агульнай рэд. Р. Платонава і У. Коршука. – Мн., 2001.
2. Гісторыя Беларусі: У 6 т. Т. 5. Беларусь у 1917 – 1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэдактар) і інш. – Мн., 2006.
3. *Кароль, А.* Беларусізацыя / А. Кароль // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн., 1993. – Т. 1. – С. 348 – 350.
4. *Лыч, Л.* Беларусізацыя 20-х гадоў / Л. Лыч // Маладосць. – 1995. – № 11. – С. 187 – 211.
5. *Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн., 1996.
6. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М. Касцюк, І. Ігнаценка, У. Вышынскі і інш. – Мн., 1995. – Ч. 2.
7. *Парашкоў, С.* Гісторыя культуры Беларусі / С. А. Парашкоў. – Мн., 2004.


## Дадатковая літаратура


1. *Адамушка, У.* Палітычныя рэпрэсіі 20 – 50-х гадоў на Беларусі / У. Адамушка. – Мн., 1994.
2. Акадэмік Гаўрыла Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы. – Мн., 2000.
3. *Альшэўская, С.* Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва на Беларусі (1917 – 1927 гг.) / С. І. Альшэўская, В. Ф. Касовіч, Л. А. Шульга. – Мн., 2000.
4. *Андрэева, Е.* Антон Баліцкі – педагог і стваральнік нацыянальнай школы на Беларусі / Андрэева Е. Г. // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 9. – С. 13 – 24.
5. *Андрэева, Е.* Аркадзь Смоліч і яго ўклад у нацыянальную педагогіку / Андрэева Е. Г. // Народная асвета. – 1996. – № 9. – С. 135 – 142.
6. *Андрэева, Е.* Усевалад Ігнатоўскі – асветнік, педагог / Андрэева Е. Г. // // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 12. – С. 9 – 19.
7. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. – Мн., 1996 – 2004. – Т. 1 – 18.
8. Беларускія пісьменнікі: 1917 – 1990. – Мн., 1994.
9. Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўнік: у 6 т. / [рэдкал.: А. Мальдзіс і інш.]. – Мн., 1992 – 1995. – Т. 1 – 6.
10. *Брыгадзін, П.* Усевалад Ігнатоўскі: палітычны дзеяч, вучоны / П. І. Брыгадзін. – Мн., 1998.
11. *Васілеўская, Н.* Абвінавачваецца ў нацыянал-дэмакратызме (пра наркома асветы Беларусі А. В. Баліцкага) / Н. Васілеўская. – Мн., 1995.
12. *Вялікі, А.* Чырвоная беларусізацыя / А. Вялікі // Спадчына. – 2001. – № 3. – С. 50 – 51.
13. *Гарэцкі, Г.* Выбранае / Г. Гарэцкі. – Мн., 2002.
14. *Гесь, А.* Калінінская акруга: Хроніка беларускага культурнага жыцця 1920-х гадоў / А. Гесь // Спадчына. – 2001. – № 3. – С. 3 – 49.

15. *Гужалоўскі, А*. Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі – у пошуках вытокаў / А. Гужалоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 1995. – № 4. – С. 100 – 108.
16. *Жылінскі, Г.* Ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі ў 20-ыя гады / Г. Жылінскі // Адукацыя і выхаванне. – 1996. – № 8. – С. 32 – 36.
17. Інстытут беларускай культуры / Пад рэд. М. П. Касцюка, П. Ц. Петрыкава, М. У. Токарава і інш. – Мн., 1993.
18. *Іофе, Э.* Бацька беларусізацыі / Э. Іофе // Беларуская мінуўшчына. – 1995. – № 2. – С. 59 – 62.
19. *Каляда, І. У.* Беларусізацыя: шляхі і метады ажыццяўлення / І. У. Каляда. – Мн., 1997.
20. *Кандыбовіч, С.* Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі / С. Кандыбовіч. – Мн., 2000.
21. *Кароль, А.* Беларусізацыя – палітыка нацыянальнага адраджэння / А. Кароль // Крыжовы шлях. – Мн., 1993. – С. 118 – 164.
22. *Касцюк, М.* Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. – Мн., 2000.
23. *Клімаў, І.* Беларусізацыя ў дакументах / І. Клімаў // Беларускі Гістарычны Агляд. – 2001. – Том 8. – Сшыткі 1 – 2 (14 – 15). – С. 273 – 295.
24. *Кнорин, В. Г.* Избранные статьи и речи / В. Г. Кнорин. – Мн., 1990.
25. *Кулажанка, Л.* З гісторыі беларускага краязнаўства / Л. Кулажанка // Адукацыя і выхаванне. 1996. № 11. С. 106 – 111.
26. *Луцкевіч, А.* Да гісторыі беларускага руху. Выбраныя творы / А. Луцкевіч. – Мн., 2003.
27. *Луцкевіч, А.* За дваццаць пяць гадоў (1903 – 1928): Успаміны аб працы першых беларускіх палітычных арганізацый: Беларуская рэвалюцыйная грамада, Беларуская сацыялістычная грамада / А. Луцкевіч. – Мн., 1991.
28. *Лыч, Л.* Беларуская нацыя і мова / Л. Лыч. – Мн., 1994.
29. *Михнюк, В. И.* Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919 – 1941 гг.) / В. И. Михнюк. – Мн., 1985.
30. *Міхнюк, У.* Захоўваць вечна: справа № 20951 – С / У. Міхнюк // Маладосць. – 1992. – № 6. – С. 110 – 115.
31. *Мяснікоў, А.* Нацдэмы: Лёс і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка / А. Мяснікоў. – Мн., 1993.
32. На крутым павароце. Ідэолага-палітычная барацьба на Беларусі ў 1929 – 1931 гг. Дакументы, матэрыялы, аналіз. – Мн., 1999.
33. Наука Беларуси в ХХ столетии / НАН Беларуси; редкол.: Н. А. Борисевич и др. – Мн., 2001.
34. *Платонаў, Р.* Акадэмічная канферэнцыя па рэформе беларускага правапісу і азбукі / Р. Платонаў // Роднае слова. – 1991. – № 11. – С. 82 – 92.
35. *Платонаў, Р.* Лёсы. Гісторыка-дакументальныя нарысы аб людзях і малавядомых падзеях духоўнага жыцця ў Беларусі 20-х – 30-х гг. / Р. Платонаў. – Мн., 1998.

36. *Платонаў, Р.* Палітыкі. Ідэі. Лёсы: грамадзянскія пазіцыі ва ўмовах нарастання ідэолага-палітычнага дыктату ў Беларусі 20 – 30-х гг. / Р. Платонаў. – Мн., 1996.
37. *Платонаў, Р.* Старонкі гісторыі Беларусі: архівы сведчаць: З навук. спадчыны / Р. Платонаў. – Мн., 2002.
38. *Платонов, Р.* Перед крутым поворотом: тенденции в политической и духовной жизни Беларуси (1925 – 1928): Отражение времени в архивных документах / Р. Платонов. – Мн., 2001.
39. *Раманава, І.* Беларусь перажывае бурнае нацыянальнае адраджэнне пад уплывам камуністаў. Акадэмічная канферэнцыя 1926 г. у галасах відавочцаў / І. Раманава // Arche Пачатак. – 2006. – № 1 – 2. – С. 92 – 104.
40. Тэатральная Беларусь: энцыклапедыя: у 2 т. / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў і інш. – Мн., 2002 – 2003.
41. *Улашчык, М.* Выбранае / М. Улашчык. – Мн., 2001.
42. *Чарвякоў, А.* Я ніколі не быў ворагам. Выбраныя артыкулы і прамовы. Успаміны сучаснікаў / А. Чарвякоў. – Мн., 1992.
43. *Шчакаціхін, М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Мн., 1993.
44. *Шыбека, З.* Нарыс гісторыі Беларусі (1795 – 2002) / З. Шыбека. – Мн., 2003.
45. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мн., 1993 – 2004. – Т. 1 – 6.
46. *Янушкевіч, Я.* Неадменны сакратар Адраджэння: Вацлаў Ластоўскі / Я. Янушкевіч. Мн., 1995.

## Рэсурсы аддаленага доступу

1. *Гардзіенка, А.* Гісторык, які перайграў гісторыю / А. Гардзіенка // Arche Скарына [Электронны рэсурс]. – 2000. – № 4. – Рэжым доступу: http://arche.bymedia.net/4-2000/hardz400.html. – Дата доступу: 13.08.2007.
2. *Кандыбовіч, С.* Разгром нацыянальнага руху ў Беларусі / С. Кандыбовіч [Электронны рэсурс]. – 2000. – Рэжым доступу: http://belsoch.exe.by/lib/books/php/razhrom.php?n_cat=35&n_kniga=12. – Дата доступу: 13.08.2007.
3. *Клімаў, І.* Беларусізацыя ў дакументах / І. Клімаў // Беларускі Гістарычны Агляд [Электронны рэсурс]. – 2001. – Рэжым доступу: http://www.lingvo.minsk.by/~bha/08/273.htm. – Дата доступу: 13.08.2007.
4. *Мяснікоў, А.* Беларусізацыя як дзяржаўная палітыка ў 20-я гады XX стагоддзя / А. Мяснікоў // Беларускі Гістарычны Зборнік. – Białoruskie Zeszyty Historyczne [Электронны рэсурс]. – 2001. – № 16.– Рэжым доступу: http://kamunikat.net.iig.pl/www/czasopisy/bzh/16/16kom_miasnikou.htm. – Дата доступу: 13.08.2007.
5. *Раманава, І.* Беларусь перажывае бурнае нацыянальнае адраджэнне пад уплывам камуністаў. Акадэмічная канферэнцыя 1926 г. у галасах відавочцаў / І. Раманава // Arche Пачатак [Электронны рэсурс]. – 2006. – № 1 – 2. – Рэжым доступу: http://arche.bymedia.net/2006-1/ramanava106.htm. – Дата доступу: 13.08.2007.